

102-ГАДОВЫ ДЫВЕРСАНТ І РАЗВЕДЧЫК 6

ПЛАКУЧАЯ ЯЛІНА І ЗАЧАРАВАНАЯ ПЯЧОРА 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЛІПЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 141 (29008)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня КДК:**

*«Не думаю, што Камітэт дзяржкантролю сёння быў бы такі, калі б адставаў ад сучасных тэндэнцый развіцця грамадства і эканомікі. Мы павінны апярэджваць час, працаваць на апярэджанне, каб не дапусціць развіцця негатыўных праяў. Дзейнасць камітэта шмат у чым залежыць ад існуючай эканамічнай сітуацыі, атмасферы ў грамадстве. Пасля таго як сітуацыя стабілізавалася, пастараліся памяняць падыходы ў кантрольнай дзейнасці, заклаўшы ў практыку, напэўна, галоўны прынцып, які дзейнічае і сёння, — «не нашкодзь». Зыходзячы з гэтага прынцыпу, мы выбудоўваем стратэгію і тактыку работы камітэта. Укараняюцца новыя метады. Ведамства перайшло ад татальных праверак да маніторынгаў, укаранёны прынцып аўдыту эфектыўнасці дзейнасці, калі ацэньваецца не нейкае парушэнне, а КДК дае заключэнне, наколькі эфектыўна суб'ект, які правяраецца, траціць дзяржаўныя сродкі, распараджаецца ўласнасцю».*

# АБЕД ПА РАСКЛАДЗЕ



**У СВК «Маяк Браслаўскі» Браслаўскага раёна на жніве шчыруюць 18 камбайнаў, якімі ўжо апрацавана больш за тысячу семсот гектараў збожжавых. Лідзіруюць на жніве браты Міхаіл і Віктар ВАЙТАНЕЦ — імі абмалочана з пачатку кампаніі больш за васемсот тон збожжа.** **СТАР. 7**



У камбайнераў «Маяка» абед.
На першым плане — Іван КУЛЬПА, Міхаіл ВАЙТАНЕЦ і яго брат Віктар ВАЙТАНЕЦ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **У Беларусі на 1 ліпеня пражывае крыху менш за 6 тысяч ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.**
- Гродзенскі рэканструктар Андрэй Блажэвіч стварыў копію малой баявой ладдзі эпохі вікінгаў X ст.



- **3 жніўня ў Верхнім горадзе Мінска пройдзе свята карэйскай культуры.**
- Магістрант з Будапешта Давід Ковары за суткі наведаў на веласіпедзе сем краін.

ISSN 1990 - 763X

19141

9 771990 763008

Прыёмная кампанія — 2019

# У ТРЭНДЗЕ — ПРАГРАМІСТЫ І ЖУРНАЛІСТЫ

### У БДПУ і БНТУ адзначаюць рост прахадных балаў

**Напрыканцы мінулага тыдня ва ўсіх беларускіх ВНУ завяршылася залічэнне на бюджэтную форму навучання.** **СТАР. 3**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ПА АБНОЎЛЕНЫМ ПРАЦОЎНЫМ КОДЭКСЕ

### Пачнём працаваць у наступным годзе

**Нядаўна Прэзідэнт Беларусі падпісаў закон аб зменах у Працоўны кодэкс. Як кажуць спецыялісты, гэтыя змены ўлічваюць інтарэсы як работнікаў, так і наймальнікаў, а таксама сучасныя тэндэнцыі на рынку працы. Разгледзім асноўныя навацыі закона.**

**КАНТРАКТЫ НА ГОД СЫДУЦЬ У МІНУЛАЕ**

Па выніках маніторынгу, праведзенага летась, высветлілася, што больш за 60 % працоўных кантрактаў заключаны тэрмінам на год. Згодна з абноўленым Працоўным кодэксам, работнік, які адказна ставіцца да сваіх абавязкаў, цяпер можа разлічваць на больш працяглы кантракт. Так, калі работнік упершыню ўладкоўваецца на прадпрыемства, з ім можна заключыць кантракт на год. Але далей, калі паўстае пытанне падаўжэння працоўных адносін, наймальнік абавязаны прапанаваць работніку, які не дапускае парушэнняў працоўнай дысцыпліны, кантракт да заканчэння максімальнага тэрміну яго дзеяння — гэта значыць да пяці гадоў. Калі па заканчэнні пяцігадовага тэрміну наймальнік і работнік маюць намер працягваць працоўныя адносіны, новы кантракт павінен быць адразу на тры гады. На меншыя тэрміны кантракты будуць працягвацца (альбо заключацца новыя) толькі з пісьмовай згоды работніка. Акрамя таго, пасля заканчэння тэрміну дзеяння пяцігадовага кантракта наймальнік мае права заключыць з добрасумленным работнікам працоўны дагавор на нявызначаны тэрмін.

Што датычыцца пенсіянераў, якія працуюць, то для большай абароны іх правоў пры звальненні ў сувязі з парушэннем наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора або кантракта работнікам пенсійнага ўзросту цяпер таксама будзе выплачвацца мінімальная кампенсацыя ў памеры трох сярэднямесячных зарплат. **СТАР. 7**